# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ!



# ГОНАР ВАМ І СЛАВА

М. СТАРАВОЙТАЎ,
сакратар партыйнага камітэта універсітэта

Сакавік — першы вясновы месяц. І знамянальна, што ўжо ў самым яго пачатку адзін з дзён пазначаны чырвонымі літарамі. Гэта — 8 Сакавіка. Народы нашай шматнацыянальнай неабсяжнай краіны, усё чалавецтва штогод адзначаюць яго як вялікае свята працаўніц планеты — Міжнародны жаночы дзень. З яго надыходам жанчыны ўсіх краін і кантынентаў падводзяць вынікі сваёй нястомнай дзейнасці, з'ядноўваюць рады для агульнай барацьбы за раўнапраўе і сацыяльны прагрэс, за мір і шчасце ўсіх дзяцей Зямлі.

Краіна Саветаў з'явілася першай дзяржавай, дзе ў выніку перамогі Вялікага Кастрычніка і пабудовы сацыялізму быў ажыццёўлены ленінскі запавет аб раўнапраўі. Жанчыны нашай краіны валодаюць усёй паўнатой сацыяльна-эканамічных і палітычных праў і свабод, апавешчаных і гарантуемых Канстытуцыяй СССР.

Сёння нельга пераацаніць заслуг савецкіх жанчын перад сацыялістычнай Айчынай. Яны ўнеслі велізарны ўклад у перамогу сацыялізму, разгром гітлераўскіх захопнікаў, адыгрываюць велізарную ролю ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Плённая іх праца на заводах, фабрыках і будоўлях, на палях і фермах, на ніве народнай асветы і аховы здароўя, у сферы абслугоўвання. Клапатлівай працай жанчын многае робіцца для развіцця навукі і росквіту культуры, выхавання падрастаючага пакалення. Яны шырока далучаюцца да кіраўніцтва вытворчымі калектывамі, партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі, камсамольскімі і іншымі грамадскімі органамі. У СССР забяспечана самая высокая ў свеце занятасць жанчын грамадска-карыснай працай: больш 93 працэнтаў жанчын працаздольнага ўзросту працуе або вучыцца.

Партыя і дзяржава праяўляюць велізарны і пастаянны клопат аб паляпшэнні ўмоў працы, быту, адпачынку і выканання абавязкаў мацярынства, аб павышэнні ролі жанчын у грамадстве і сям'і. Самаадданай і творчай працай на ўсіх участках камуністычнага будаўніцтва адказваюць савецкія жанчыны на праяўляемыя аб іх клопаты.

Аб раўнапраўі жанчын з мужчынамі, іх вялікім укладзе ў вырашэнне агульнанародных задач камуністычнага будаўніцтва яскрава сведчаць прыклады нашага універсітэта. У яго сценах больш адной трэці прафесарска-выкладчыцкага саставу складаюць жанчыны. 56 з іх — кожная чацвёртая з ліку маючых у ГДУ вучоныя ступені і званні — жанчыны.

На працягу многіх год дэканам гісторыка-філалагічага факультэта, пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва ва універсітэце за 1981 год, з'яўляецца кандыдат гістарычных навук, дацэнт Т. І. Язэпава. Ужо не першы год паспяхова спраўляецца з абавязкамі дэкана завочнага факультэта дацэнт А. В. Саннікава. Плённа працуюць калектывы кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі і кафедры беларускай літаратуры, якія ўзначальваюць дацэнты З. М. Сарока і В. І. Смыкоўская. Вялікі ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй уносяць дацэнты кафедры філасофіі Л. І. Нядзеля, Т. П. Гараніна і многія іншыя выкладчыцы нашага калектыву.

Удзельная вага жанчын, якія набываюць цяпер вышэйшую адукацыю ў СССР, перавышае 50 працэнтаў. Яшчэ больш высокі гэты паказчык у нашым універсітэце.

Паўсюдна жанчын надзяляюць высокім давер'ем. Так, у час апошніх выбараў у мясцовыя Саветы студэнтка эканамічнага факультэта Маіса Кучарэнка выбрана ў абласны, а студэнтка матэматычнага факультэта Людміла Кардзіяк — у гарадскі Саветы народных дэпутатаў. Кандыдатам у члены гарадскога камітэта партыі з'яўляецца студэнтка эканамічнага факультэта Наталля Новікава. На нядаўна прайшоўшай абласной справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі другакурсніца эканамічнага факультэта Зінаіда Дзенісенка выбрана членам бюро абласнога камітэта ЛКСМБ і дэлегатам XIX з'езда ВЛКСМ.

Мы з задавальненнем гаворым аб тым, што сярод выдатнікаў вучобы ва універсітэце большасць складаюць студэнткі. Яны актыўна ўдзельнічаюць у рабоце камсамольскіх, прафсаюзных і іншых арганізацый, у правядзенні разнастайных культурна-масавых мерапрыемстваў.

Ад імя парткома, рэктарата, грамадскіх арганізацый універсітэта дазвольце шчыра павіншаваць вас, нашы слаўныя жанчыны, з Міжнародным жаночым днём. Моцнага вам здароўя, асабістага шчасця, вялікіх поспехаў у працы і вучобе на карысць далейшага росквіту нашай сацыялістычнай Радзімы!


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 7 (494) | Субота, 6 сакавіка 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


М. ЛИСЯНСКИЙ

* * *

Женщина — утро
безбрежного дня,
Солнечный луч
Из далёкого детства...
Жалко, что мать
не услышит меня:
Войны нам боль
оставляют в наследство.
Женщина другом была
и сестрой,
Юной невестой,
Берёзкою русской,
Матерью Ленина —
Умной, простой,
Верной подругой —
Надеждою Крупской.
Женщина!
Всё победила она:
Боль и разлуку,
И смерть, и усталость.
Девочка, девушка,
Мать и жена,
Сколько ей горя
и счастья досталось!
Женщина!
Праздник её красоты
К людям приходит
Как радостный вестник.
Мать Человечества!
Ей все цветы,
Все наши сказки
И все наши песни.

## Расказваем пра дэлегата XIX з'езда ВЛКСМ

КАЛІ параўнаць шлях З. Дзенісенка з аднакурснікамі, то становіцца бачным: Зінаіда — самастойны чалавек. Прыйшла яна ва універсітэт пасля доўгага роздуму. Канчатковае рашэнне сфарміравалася за гады працы на заводзе электраапаратуры. Менавіта гады, праведзеныя ў рабочым калектыве, адыгралі рашаючую ролю ў станаўленні характару дзяўчыны. Нешматслоўная, у голасе іншы раз чуюцца рашучыя ноткі. Магчыма, гэтым звяртае яна на сябе ўвагу.

Ужо на заводзе Зінаіду выбіраюць камсоргам вытворчага ўчастка. Тут яна праяўляе рысы камсамольскага актывіста: і свае ўласныя думкі, і ўменне іх адстойваць. Ва універсітэце, на падрыхтоўчым аддзяленні, дзе спачатку Дзенісенка вучылася, асабліва цэняцца ўсе гэтыя якасці. Большасць слухачоў тут самі маюць працоўны стаж, ведаюць, што ў чалавеку з'яўляецца найбольш каштоўным. Зіна таксама ў ліку актывістаў камсамольскай работы. Яна — член бюро аддзялення. Работа гэта стала для яе такой жа натуральнай, як патрэба ў ведах. На першым курсе эканамічнага факультэта ў якасці члена камсамольскага бюро, Зінаіда многа займалася арганізацыяй СБА, падрыхтоўкай іх да работы ў трэцім семестры. Ей падабаецца працаваць у атрадзе. У гэтым бачыцца зварот да яе заводскага жыцця, калі нават адносіны паміж людзьмі становяцца зу-

# АКРЫЛЕНАСЦЬ



сім іншымі, чым ва універсітэцкай аўдыторыі. Гэта адносіны сур'ёзных, самастойных людзей, якія разам, сваімі рукамі робяць карысную для краіны справу. Тады словы аб тым, што студэнцкія будаўнічыя атрады — гэта вялікая сіла, значная падмога народнай гаспадарцы, становяцца адчувальныя. Ды і цікава назіраць, як хутка ў такіх умовах сталеюць тыя аднакашнікі.

Байцоўскі вопыт, набыты летам 1980 года ў атрадзе «Геліас», вельмі дапамог Зінаідзе наступным летам. Тады яе прызначылі камандзірам будаўнічага атрада «Аэліта».

Зараз ідзе падрыхтоўка да чарговага працоўнага семестра. У Зінаіды, цяпер ужо камісара штаба працоўных спраў універсітэта, шмат рознай работы. Ідзе распрацоўка тэматыкі лекцый, якія прачытаюць байцы СБА летам перад насельніцтвам, рыхтуецца агляд-конкурс агітбрыгад. Кожны атрад залічвае ў свае рады ганаровага байца. Усё гэта камісарскія справы.

Ёсць і яшчэ прычына для хваляванняў: прадстаіць паездка ў Маскву на XIX з'езд камсамола. Выбранне Зінаіды дэлегатам з'езда, членам бюро абкома ЛКСМБ стала падзеяй у жыцці ўсёй камсамольскай арганізацыі універсітэта. Калі аб гэтым стала вядома, у вучэбных карпусах і інтэрнатах з'явіліся маланкі: «Віншуем!..» І Зінаіда Дзенісенка, малады камуніст, добра ўсведамляе, што ў яе асобе гонар аказаны ўсёй нашай навучальнай установе, а таму трымаецца падкрэслена сціпла. Наогул, гаварыць аб сабе, сваіх справах не любіць. У размове ўжывае куды часцей «мы», чым «я». А гэта, між іншым, рыса таксама сапраўды камсамольская. адна з лепшых.

М. КАЗАКОВА.

НА ЗДЫМКУ: дэлегат XIX з'езда ВЛКСМ Зінаіда ДЗЕНІСЕНКА.

Фота У. Чысціка.

# ПРЫСВЕЧАНЫ МІЖНАРОДНАМУ ДНЮ

Учора ў актавай зале адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны святу 8 Сакавіка. Уступным словам яго адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

З дакладам аб Міжнародным жаночым дні выступіла загадчыца кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі дацэнт З. М. Сарока.

Ва ўрачыстай абстаноўцы быў зачытаны загад па універсітэту, у якім рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць павіншаваў жанчын са святам, а лепшым выкладчыцам, супрацоўніцам і студэнткам за плённую працу, выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць аб'явіў падзяку.

На сцэне з вялікім святочным канцэртам выступілі самадзейныя артысты ГДУ і дзіцячы харавы калектыў «Праleскі» СШ № 43, які быў узнагароджаны Ганаровай граматай камітэта ЛКСМБ.




# ГАНАРОВЫ ПРЫЗ

Нядаўна цэнтральны савет студэнцкага добраахвотнага таварыства «Буравеснік» падвёў вынікі ўсесаюзнага агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку агітацыі і прапаганды фізічнай культуры і спорту сярод студэнцкай моладзі краіны. Нашу рэспубліку на конкурсе прадстаўлялі Гомельскі дзяржаўны універсітэт і Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. У ходзе агляду ацэньвалася агітацыйна-прапагандысцкая работа па наступных напрамках: стацыянарныя сродкі нагляднай агітацыі, нагрудная атрыбутыка, тэматычныя фотаальбомы, лекцыйная прапаганда, плакаты і лозунгі, прапаганда фізічнай культуры і спорту ў перыядычным і насценным друку і г. д.

Першы прыз журы прысудзіла нашаму універсітэту, другі — мінчанам.

Белсавет СДСТ «Буравеснік» таксама вырашыў праводзіць аналагічныя агляды-конкурсы сярод ВНУ Беларусі. Два лепшыя студэнцкія калектывы атрымаюць права удзельнічаць ва ўсесаюзным аглядзе.

# ЛЕКЦЫЙНУЮ ПРАПАГАНДУ — НА ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ

Работа таварыства «Веды» нашага універсітэта праводзіцца пад знакам далейшага пашырэння і паглыблення прапаганды марксісцка-ленінскай тэорыі, унутранай і знешняй палітыкі КПСС, дасягненняў сучаснай навукі і тэхнікі, мабілізацыі працоўных на паспяховае выкананне рашэнняў партыі і ўрада.

Універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды» налічвае 353 члены. Сярод іх — акадэмік АН БССР, член-карэспандэнт АН БССР, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР, 15 доктараў і 193 кандыдаты навук. Таму без перабольшвання можна сказаць, што прапаганда ведаў праводзіцца вопытнымі лектарамі.

Нашы лектары частыя госці ў студэнцкіх групах, інтэрнатах універсітэта, у настаўніцкіх калектывах горада і вобласці, у планетарыі, у школах «Юны фізік», «Юны геолаг», «Юны тэхнік», «Юны матэматык», выступаюць на прамысловых прадпрыемствах. З іх удзелам праводзяцца навукова-тэхнічныя кансультацыі і нарады на прамысловых прадпрыемствах. За два апошнія гады было прачытана 6216 лекцый.

Найбольш актыўнымі нашымі лектарамі з'яўляюцца Б. В. Бокуць, М. І. Старавойтаў, Г. Д. Ветлугаеў, А. Д. Ціханскі, Ж. А. Герасімава, У. Я. Мацюшэнка, У. М. Калмыкоў, В. П. Галееў, Я. В. Яршоў-Мазураў, В. У. Матусевіч, А. П. Мяшчэрскі. Ва універсітэце ўжо шмат гадоў паспяхова працуе «Школа маладога лектара», кіруе якой Э. М. Энцін.

Пярвічная арганізацыя таварыства клапоціцца аб пашырэнні тэматыкі лекцыйнай прапаганды, запрашае вучоных і спецыялістаў з буйных навуковых цэнтраў. Так, для студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ ў гэтым годзе арганізаваны цыклы лекцый: «Сям'я, мараль, культура ва ўмовах развітога сацыялізму», «Рэлігія ў сучасным свеце», «XXVI з'езд КПСС: умацаваць мір, паглыбіць разрадку, утаймаваць гонку ўзбраенняў». Першыя два цыклы чытаюць ленінградскія лектары, апошні — вучоныя Маскоўскага інстытута міжнародных адносін.

Былі праведзены грамадска-палітычныя чытанні «Ад з'езда да з'езда». У іх прынялі ўдзел лектары нашага універсітэта і Цэнтральнага раёна: Г. П. Марозава, У. С. Дайнека, А. П. Смоліна, Т. П. Гараніна, У. Ф. Бондараў, Э. М. Энцін, М. І. Рабенькі, П. С. Стракалаў, М. Н. Хаед, С. І. Лябікаў.

Штогод для выпускнікоў ГДУ па факультэтах чытаюць лекцыі па юрыдычнай тэматыцы супрацоўнікі пракуратуры Цэнтральнага раёна, абласнога суда, юрыдычнай кансультацыі.

У пачатку 1982 года былі праведзены сустрэчы студэнтаў і выкладчыкаў ГДУ з журналістам Б. Д. Зюкавым. Частымі гасцямі на факультэтах і ў інтэрнатах сталі мастацтвазнаўца В. Г. Сырамятнікаў, лектар-міжнароднік М. І. Камянецкі, Героі Савецкага Саюза П. С. Стракалаў і В. Ф. Мухін.

Імкнемся мы выкарыстоўваць і прыезд у горад вучоных. Перад калектывам універсітэта выступалі кандыдат геолага-мінералагічных навук В. К. Галубцоў з Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута, кандыдат тэхнічных навук В. П. Мельнікаў з Інстытута электронікі АН БССР.

Па даручэнню гаркома партыі на фізічным факультэце кафедрай тэарэтычнай фізікі (загадчык — М. В. Максіменка) рыхтуецца лекцыя «Сапраўдны сэнс «гуманнай» зброі». Гэтую лекцыю мяркуецца прачытаць не толькі на факультэтах і ў інтэрнатах універсітэта, але і на прадпрыемствах горада.

На факультэце фізічнага выхавання распрацаваны і ўжо чытаецца цыкл лекцый «Фізкультура, праца, здароўе».

Л. І. Брэжнеў у Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXVI з'езду партыі адзначаў: «Нельга забываць, што ўмовы, у якіх мы жывем, значна змяніліся. Другім стаў савецкі чалавек. Абагаціліся яго веды, павысілася эрудыцыя, значна выраслі духоўныя патрабаванні. З другога боку, узрасла актыўнасць прапагандысцкіх сродкаў класавага праціўніка, узмацніліся яго спробы аказваць разлагаючае ўздзеянне на свядомасць савецкіх людзей. Трэба належным чынам улічваць гэтыя новыя з'явы і абставіны. У сувязі з гэтым уся ідэйна-выхаваўчая работа павінна весціся жыва і цікава, без штампаваных фраз і стандартнага набора гатовых формул».

Неабходна пярвічным арганізацыям ГДУ ўлічваць станоўчы вопыт у рабоце пярвічнай арганізацыі біялагічнага факультэта, шырэй выкарыстоўваць розныя формы прапаганды ведаў (экскурсіі, выступленні па тэлебачанні) і метады. Добрую прапанову ўнесла пярвічная арганізацыя таварыства «Веды» кафедры палітэканоміі: павялічыць колькасць лекцый для работнікаў сельскай гаспадаркі ў сувязі з неабходнасцю выканаць у адзінаццатай пяцігодцы харчовую праграму партыі.

30 снежня гэтага года ўвесь савецкі народ будзе адзначаць 60-годдзе ўтварэння СССР. Усім пярвічным арганізацыям прадстаіць распрацаваць і ажыццявіць план мерапрыемстваў па дастойнай сустрэчы гэтай знамянальнай даты.

**У. АНТРОПАЎ,**
**старшыня праўлення таварыства «Веды» ГДУ, дацэнт кафедры радыёфізікі.**



# ДЛЯ ЎЗАЕМААБАГАЧЭННЯ

У наш універсітэт прыехала група студэнтаў Тартускага дзяржаўнага універсітэта Эстонскай ССР. Сем дзяўчат, будучых філолагаў, у парадку таварысцкага абмену будуць працягваць вучобу на аддзяленні рускай мовы і літаратуры гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ.

На мінулым тыдні адбылася сустрэча гасцей — эстонскіх студэнтак з членамі Клуба інтэрнацыянальнай дружбы нашага універсітэта. Яна была арганізавана камітэтам камсамола, студэнтамі матэматычнага факультэта, адказнай за работу КІДа Людмілай Царовай. У цёплай і сардэчнай абстаноўцы прайшла сустрэча з эстонскімі сябрамі. Дзяўчаты з братняй рэспублікі расказалі пра свой універсітэт, вучобу, перспектывы развіцця Эстоніі ў XI пяцігодцы.

Студэнты беларускага аддзялення гісторыка-філалагічнага факультэта Анатоль Казлоў, Лідзія Кукштэль, Аляксандр Бяляцкі расказалі гасцям пра наш горад, рэспубліку. Член камітэта камсамола Л. Царова пазнаёміла эстонскіх студэнтак з мерапрыемствамі, якія намеціў Клуб інтэрнацыянальнай дружбы універсітэта па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ і 60-годдзя ўтварэння СССР.

У час правядзення дыскатэкі, якая была наладжана пасля гэтай сустрэчы, нашы госці мелі магчымасць пазнаёміцца з гомельскімі студэнтамі бліжэй, набыць шмат новых сяброў.

**С. ГУЛЯЕЎ,**
**член камітэта камсамола, студэнт гістфіла.**

**На здымку:** студэнткі Тартускага дзяржаўнага універсітэта гутараць з чацвёртакурсніцай гісторыка-філалагічнага факультэта Людмілай Мышкоўскай.

Фота **У. Чысціка.**




# СПАБОРНІЧАЮЦЬ ГРУПЫ

Завяршыўся прамежкавы этап конкурсу на лепшую студэнцкую групу. Камітэт камсамола універсітэта на сваім чарговым пасяджэнні падвёў яго вынікі.

Умовамі конкурсу прадугледжваецца вялікая праграма пытанняў, якія неабходна было выканаць калектыву групы для таго, каб стаць пераможцай: добрая вучоба, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўсіх студэнтаў, цікавыя справы і г. д.

Па выніках прамежкавага этапа — з улікам адзнак зімовай сесіі — першае месца занялі: сярод першых курсаў — група Т-12, другіх — гр. 0-22, трэціх — гр. Р-32, чацвёртых — гр. БР-41, пятых — гр. Б-52; другое месца занялі: сярод першых курсаў— гр. 0-12, другіх — гр. Ф-21, трэціх — гр. 0-31, чацвёртых— гр. Т-44.

Пераможцам уручаны граматы камітэта камсамола ГДУ і прафкома, пераходныя вымпелы.

Прамежкавы этап конкурсу не падводзіць канчатковых вынікаў. Ён цікавы тым, што гэта проста прыкідка сіл і магчымасцей, пасля яго заканчэння ў спаборніцтва зноў уступаюць усе групы ўсіх курсаў, і шанц стаць пераможцай ёсць у кожнай з іх. Апошняе слова — за другім этапам конкурсу, які вызначыць удзельнікаў абласнога, а магчыма, і рэспубліканскага спаборніцтва лепшых студэнцкіх груп.

**Аляксандр КАЗАКОЎ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбна-навуковай рабоце.**

# ГАЛОЎНАМУ ФОРУМУ — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

**Ва універсітэце** праходзяць факультэцкія камсамольскія сходы, на якіх абмяркоўваюцца і прымаюцца павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ. Такія сходы прайшлі ўжо на біялагічным, эканамічным, матэматычным факультэтах. У аснове абавязацельстваў кожнага факультэта паасобку ляжаць мерапрыемствы камітэта камсамола універсітэта, прысвечаныя знамянальнай падзеі ў жыцці моладзі нашай краіны. Галоўным у іх будуць 19 ударных тыдняў. У іх праграму ўваходзяць выдатная вучоба, правядзенне палітінфармацый, сустрэчы з ветэранамі камсамола. Плануецца правесці конкурсы нагляднай агітацыі. Культурна-масавыя мерапрыемствы прадугледжваюць, у прыватнасці, новыя нумары мастацкай самадзейнасці, прысвечаныя жыццю камсамола, яго гісторыі. Пройдуць спартыўныя мерапрыемствы, таксама прысвечаныя галоўнаму форуму камсамоліі. Будуць выходзіць спецыяльныя «маланкі» з паведамленнямі аб лепшай студэнцкай групе, аб лепшых студэнтах. Актывізуецца работа факультэцкіх прэс-цэнтраў, штабоў «Камсамольскага пражэктара».

Абмяркоўваліся на сходах і вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі, высвятляліся прычыны зніжэння паспяховасці, адшукваліся шляхі яе паляпшэння. У сувязі з гэтым адзначалася, што неабходна больш увагі аказваць першакурснікам, узмацніць ролю саветаў выдатнікаў. Немалаважна ва ўсім гэтым станаўленне ўнутрысаюзнай дысцыпліны, барацьба з раўнадушшам, выхаванне ў камсамольцаў пачуцця адказнасці.

**(Наш кар.).**

*Пісьмо ў рэдакцыю*

# ШЧЫРАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

Многія гады я карыстаюся кнігамі універсітэцкай бібліятэкі. Яе работнікі заўсёды чула і ўважліва сустракаюць мяне, дапамагаюць у выбары неабходнай літаратуры, даюць карысныя парады. За доўгія гады я заўважыла, што добразычлівасць у адносінах да чытачоў — гэта адметная рыса універсітэцкіх бібліятэкараў. Іх адрознівае высокая культура паводзін, імкненне зрабіць чалавеку прыемнае.

І цяпер, ужо на пенсіі, я па-ранейшаму часта прыходжу ў бібліятэку, мяне сустракаюць з увагай.

Хачу праз газету «Гомельскі універсітэт» павіншаваць В. М. Касцючэнкаву, Л. К. Сальнікаву, В. В. Кузьміну, Н. А. Гурэвіч са святам — Міжнародным жаночым днём, пажадаць ім шчасця, многіх гадоў плённай працы.

**Р. МУКАСЕЙ,**
**былая лабарантка кафедры грамадзянскай абароны, пенсіянерка.**

*ПАКАЗВАЕ СТУДЭНЦКІ ТЭАТР*

# ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ

Роля студэнцкага тэатра ў жыцці навучальнай установы множная: тут і выхаваўчы элемент, і здабыванне сэнсу жыцця, і яднанне вакол прыцягальнага для моладзі эпіцэнтра. Вялікая сіла мастацтва ў тым і адчувальная, што ад сутыкнення з ёю прыходзіць патрэба зірнуць на сябе з боку, жаданне стаць лепшым.

Усё гэта пры ўмове, што такі тэатр існуе. Падкрэсліваю гэта менавіта таму, што самадзейны тэатр «І т. п...» — адзіны такі студэнцкі калектыў у нашым горадзе. І каб гаворка не была галаслоўнай, бо тэатр і ўсё, што з ім звязана — гэта, перш за ўсё, п'есы, якія ён ставіць, пяройдзем да апошняй работы самадзейных артыстаў. На гэты раз мастацкі кіраўнік тэатра і яго, не пабаюся гэтага слова, душа — Аляксей Міхайлавіч Бычкоў выбраў для пастаноўкі п'есу У. Цендракова «Ноч пасля выпуску». Зразумела, што выбар быў аднадушна падтрыманы і рабятамі. Вельмі ўжо блізкая, сугучная ім тэма ўзнята ў гэтай п'есе. Магчыма, каму-небудзь на першы погляд пакажацца, што студэнты універсітэта ўжо «выраслі» з праблем, узнятых у школьных сцэнах. Але гэта толькі на першы погляд: яшчэ доўга будзе гучаць у душах былых дзесяцікласнікаў, іх настаўнікаў рэха той ночы пасля выпускнога балю.

А пачыналася ўсё быццам бы і нядрэнна. Уручаны атэстаты, дырэктар школы (выканаўца ролі — Вячаслаў Капытка) гаворыць слова на дарогу, у якім з мудрасцю добрага дарадцы робіць прыкладны эскіз жыццёвых шляхоў сваіх вучняў. Ён гаворыць аб тым, што дарогі, якія яны выберуць у жыцці, будуць такімі, як самі рабяты. Вельмі добрая, асветленая высокім сэнсам — у Юлі Студзёнцавай, своеасаблівага гонару школы, выдатніцы, сур'ёзнага чалавека. Будуць яны добрымі ў Гены Голікава, Наткі Быстровай, няпростай у Сакрата Анучына. Позірк дырэктара, падмацаваны шматгадовым педагагічным вопытам, імкнецца праз тоўшчу гадоў пранікнуць у тое «далёка», калі яго гадаванцы будуць дарослымі людзьмі, апорай грамадства.

У адказ — традыцыйнае выступленне ад імя выпускнікоў. Але Юля Студзёнцава (Клава Барадзіна) раптам просіць дазволу сказаць ад сябе адной. Вось тут усё і пачынаецца. Так, менавіта ў гэтую мінуту, а не тады, калі застаўшыся адны, у скверы ля помніка загінуўшым у Вялікай Айчыннай вайне юнакам, рабяты пачнуць гуляць у дзіўную гульню: «Казаць усё, да дзенца». Зусім не ўрачыста, нават неяк жорстка гучаць словы Юлі аб тым, што яна любіць школу. Юля гаворыць, а мы чуем: «Не люблю!» Гэта голас разгубленай душы, якая не ведае, куды ёй падацца. Скончыўся такі прывычны, спакойны, раз не заўсёды заведзены распарадак жыцця. Вокны — насцеж! Вольны вецер уварваўся! Ідзі, куды табе падказвае сэрца, выбірай любую дарогу. А Юлі, дарослай семнаццацігадовай дзяўчыне, хочацца назад, у спакой і цішыню. Яна аказваецца, зусім нічога не ведае пра жыццё, што бурнай паўнаводнай ракой цячэ за сценамі школы, гэтаму сапраўднаму, даросламу жыццю яе не вучылі.

Збянтэжаны настаўнікі, не менш іх — вучні. Абмяркоўваць Юліны словы — зусім не час. Тым больш усім разам. Але і ўзрушылі яны ўсіх так, што застаўшыся адны — і настаўнікі, і вучні — гавораць менавіта аб гэтым. Настаўнікі першыя пачынаюць размову. Яны, дарослыя, разумныя людзі, першымі адчулі неадпаведнасць сваёй шматгадовай мэты і дасягнутага выніка. Нешта не атрымалася, трэба разабрацца. Завуч школы (Алена Няменка) пачынае як бы ўслых разважаць. Яна шукае вінаватага. Яе пошук прыводзіць да настаўніцы рускай літаратуры і мовы Зоі Уладзіміраўны. «Не так, — гаворыць Вольга Алегаўна,—выкладала Зоя Уладзіміраўна рускую літаратуру рабятам, не змагла данесці да іх таго першапачатковага, патаемнага зместу, які заўсёды быў лепшым выхавацелем перадавой рускай інтэлігенцыі». Гэтыя словы гучаць нечакана. Але нечаканасць гэтую можна параўнаць з тым, як нечакана прарывае нарыў. Дзесьці ў глыбінях свядомасці іншыя настаўнікі адчувалі, што многае ідзе не так, як трэба, што вельмі ўжо ў многім школьная навука абасобілася ад жыцця. Тэзіс знойдзены. Пачынаецца абмеркаванне, якое ідзе амаль што да світання. Паміж аднадумцамі ўзікаюць разнагалоссі, хтосьці знаходзіць падтрымку калегі. Гэтая спрэчка — квінтэсэнцыя тых размоў, педагагічных роздумаў, дыскусій, якія ў апошнія гады літаральна выліліся на старонкі газет, часопісаў, на экраны кінатэатраў і тэлевізараў. Якое месца школы ў жыцці? Як найлепшым чынам падрыхтаваць маладога чалавека, зрабіць яго самастойным у думках, ва ўчынках? Дыскусія не скончана да гэтага часу, але дала яна ўсім многае, і, галоўнае, прымусіла многіх рэальна глядзець на жыццё. Таму няма асаблівай патрэбы доўга затрымлівацца ў настаўніцкай. Пойдзем за рабятамі!

А яны ўжо ў скверы. Спачатку проста адчуванне, такое незвычайнае і новае — свабода! Вакол гэтага адчування, вакол планаў і ідзе спачатку сумбурная, калі амаль усе адразу, размова. І толькі потым узнікае «гульня»: будзем казаць кожны пра кожнага ўсё, што думаем. Прычым, таго, што я пра сябе і так ведаю, (а гэта ў большасці выпадкаў добрае) не трэба. Вырашылі гаварыць толькі дрэннае. Пачынаючы такую небяспечную гульню, рабяты проста не ведалі, што і недахопы чалавечыя неабходна разглядаць праз прызму дабра. Амаль што жарт спачатку. Бадай што да таго моманту, калі Гена Голікаў усвядоміў: яго лепшы сябар Ігар Праухаў і ціхая Верачка абразілі яго, жорстка і несправядліва. Пажар успыхвае ў кампаніі добрых і быццам бы дружных рабят. Вынік гэтай «гульні» нарэшце прымушае спыніцца рабят: яны дагуляліся да таго, што вырашаюць «пакараць» Гену, сваім маўчаннем дапамагчы бандыту, якога байцца ўвесь горад, расправіцца з ім. І хто б вы думалі першым апамятаўся? Тая самая разгубленая Юля і яшчэ нікчэмны, агульны сябар і весялун Сакрат Анучын. Юлю прыводзіць у прытомнасць не аналітычны розум, не сумленне. Сакрат адчувае жаль. Апамятаўшыся, рабяты разумеюць, што ледзь не сталі саўдзельнікамі крывавага злачынства. Гэта, бадай, галоўны маральны ўрок той ночы.

Як бачым, п'еса глыбокая, з многімі сэнсавымі пластамі. Дарэчы сказаць, што яе пастаноўка ажыццяўлялася на паважаных прафесіянальных сцэнах краіны. Напрыклад, на сцэне Ленінградскага акадэмічнага тэатра драмы імя А. С. Пушкіна, славутай Александрынкі. Ужо адно гэта гаворыць аб складанасці і сур'ёзнасці задачы. Зразумела, што А. М. Бычкоў у вырашэнні іх зыходзіў, у першую чаргу, з магчымасцей самадзейнага калектыву. Самыя паверхневыя мэты для акцёраў, якія выконвалі ролі настаўнікаў — пераадолець узроставую адлегласць. Для занятых жа ў ролях школьнікаў тое ж — у супрацьлеглым напрамку, што было, напэўна, намнога лягчэй. Больш важныя мэты — у тым, каб як мага натуральней данесці да гледача змест і ідэю, як мага паўней разгарнуць малюнак вельмі непростай канфліктнай сітуацыі. Зразумела, што нешта аказалася магчымым, удалося. Ёсць і цяжкасці. Не хапае рабятам упэўненасці, адчування самога сябе, умення кіраваць сабой. Але і адчайвацца не трэба. Тым, хто сапраўды цікавіцца тэатрам, яго гісторыяй, добра вядома, што менавіта гэта на першых парах складала цяжкасць і для многіх прафесіянальных акцёраў. Галоўнае ў гэтым пачынанні, напэўна, любоў да тэатра, да яго асаблівага настрою. І яшчэ тое, што застанецца ў душах самадзейных акцёраў на ўсё жыццё: пачуццё яднання, пачуццё партнёра на сцэне, сябра ў жыцці.

Усім жа, хто прачытае гэты артыкул, парада: ідзіце ў тэатр. Магчыма, там вы знойдзеце адказы на свае пытанні. Магчыма, не. Але ў любым выпадку тэатр прымусіць вас задумацца, падкажа шлях, заўсёды прамы і чэсны. І не самае галоўнае, дзе гэта адбудзецца: у зале прафесіянальнага тэатра, ці ў той, дзе вы будзеце, стоіўшы дыханне, сачыць за знаёмымі вам студэнтамі-аднакашнікамі. Галоўнае — паверыць!

І ў заключэнне крыху зусім ужо прозы. Ёсць у самадзейнага тэатра і свае праблемы. Не будзем зараз пералічваць іх, але заўважым, што вялікі выхаваўчы плён тэатра заслугоўвае адпаведнай увагі да яго з боку партыйнай, камсамольскай, грамадскіх арганізацый універсітэта. Яны ў стане ў многім дапамагчы яму, зрабіць сваім саюзнікам і памочнікам у вялікай справе выхавання, таму што і студэнтам яшчэ прадстаіць выбіраць свой шлях у жыцці, шлях маральны, той, які мы называем актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

**М. ШЫМАНОЎСКАЯ.**




**НА ЗДЫМКУ:** удзельніцы самадзейнага студэнцкага тэатра «І т. п...»

Фота **У. Чысціка.**

*Грамадска-палітычная атэстацыя*

## УЛІЧЫЦЬ ПРАЛІКІ

На эканамічным факультэце прайшла атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» Атэстацыйная камісія патрабавальна і прынцыпова ацэньвала работу студэнцкіх груп.

З адказнасцю аднесліся да выканання прынятых абавязацельстваў студэнты групы 0-22 (камсорг Т. Федарцова), Т-12 (камсорг М. Шаевіч) і Т-44 (камсорг А. Твардоўская).

Прычынай таго, што многія камсамольцы факультэта не атэставаны, з'явіліся акадэмічная запазычанасць студэнтаў. Асабліва дрэнна абстаяць справы ў групе Т-31. Тут неатэставанымі аказаліся сем чалавек, у групах Т-41 і Т-33 — па чатыры. Усяго па эканомфаку не атэставаны 33 камсамольцы, што павінна стаць прадметам сур'ёзнай і прынцыповай размовы на пасяджэнні камітэта камсамола факультэта.

**Т. БУРЦАВА,**
намеснік сакратара камітэта камсамола эканамічнага факультэта па ідэалагічнай рабоце.

*ГУМАРЭСКА*

## ПАДАРУНАК

З надыходам вясны пачынаюцца для нас, мужчын, клопаты. Бегатня па парфумерных і галантарэйных аддзелах магазінаў, стаянне ў даўжэзных чэргах.

І я з першага сакавіка кожны дзень хаджу па магазінах у пошуках падарунка. Усё шукаю, шукаю, а знайсці ніяк не магу.

Іншы раз, здаецца, усё, ёсць! Але... То колерам, то формай або памерам ён не падыходзіць. Ці яшчэ які-небудзь незнаёмы добры чалавек падкажа: «Не бяры такі падарунак, ёй можа не спадабацца». І я не бяру.

Я ж хачу купіць такое, такое, каб ёй было прыемна, каб здагадалася зразумела, што значыць яна для мяне...

А на календары ўжо сёмае сакавіка. Заўтра свята жанчын, а я яшчэ нічога не прыдбаў.

З самай раніцы, кінуўшы ўсе справы, рынуўся у магазіны. Усюды чэргі, чэргі... Такіх як я — мора... Далучыўся да хваста адной з чэрг. Гляджу, бяруць мужчыны па некалькі прыгожых скрыначак у імпартнай упакоўцы. А што гэта, для чаго? Хто яго ведае. Але ўсе бяруць, застаюцца апошнія, узяў і я некалькі. Выйшаў з магазіна, уздыхнуў з палёгкай: «Ну, вось, нарэшце, і падарунак ёсць для яе...»

Раніцай 8 Сакавіка да мяне зайшоў сябар. Убачыў на стале падрыхтаваны падарунак пачаў разглядаць прыгожыя скрыначкі.

— Што ты думаеш з імі рабіць? — кінуў ён на маю пакупку.

— Як, што? Падару Віялеце.

— Ты мо здурнеў? — заліўся сябар смехам.— Што яна будзе рабіць з імі? Здаецца, вусоў і барады твая дзяўчына не мае. Куды ж яна падзене гэты крэм для галення?

Добра яшчэ, што каля пад'езда нейкая цётка прадала мне некалькі цюльпанаў.

**Анатоль КАЗЛОЎ,**
студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.

